**Цымбал А.Г.**

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1920-х гг. ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ГЕНЕРАЛЬНАГА КОНСУЛЬСТВА ПОЛЬШЧЫ Ў МІНСКУ

У Архіве Актаў Новых (Варшава, Польшча) захоўваюцца матэрыялы польскіх дыпламатычных пляцовак, а менавіта Генеральнага Консульства Польшчы ў Мінску, якое дзейнічала ў міжваенны перыяд у сталіцы Савецкай Беларусі. Супрацоўнікі консульства займаліся зборам інфармацыі ваеннага, палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага характару. Значная ўвага надавалася агляду друку, збору інфармацыі аб дзейнасці савецкіх установаў, а таксама асабістым кантактам з грамадзянамі СССР. На падставе сабранай інфармацыі даваўся аналіз працэсам, якія назіраліся ў БССР. Рыхтаваліся агляды прэсы [1, арк. 1–7], сітуацыйныя справаздачы і інфармацыйныя запіскі.

Назіранні і ацэнкі, якія прыводзяцца ў дакументах суб'ектыўныя і тэндэнцыйныя, патрабуюць навуковага ўдакладнення, але самі па сябе будучы дакументальнай крыніцай яскрава сведчаць пра складаныя супярэчнасці, якія існавалі ў Беларусі і беларускім руху, а таксама ва ўзаемаадносінах з Польшчай.

Большасць паведамленняў, якія захаваліся, датуюцца 1925, 1927 і 1929 гг. і датычацца розных аспектаў палітычнай сітуацыі ў БССР, дзейнасці вядомых асоб беларускага руху і сувязяў з Заходняй Беларуссю.

Адным з найбольш грунтоўных паведамленняў Генеральнага консульства з'яўляецца Сітуацыйная справаздача ад 4 лютага 1927 г., дзе на амаль 20 старонках прыводзіўся дэталёвы аналіз сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Савецкай Беларусі) [2, арк. 1-19].

Дыпламатамі адзначалася, што палітычнае становішча ў БССР характарызуюць дзве асноўныя рысы:

– амаль паўсюдная незадаволенасць людзей савецкай уладай;

– рост пачуцця нацыянальнай самасвядомасці ў беларускім грамадсве.

Падкрэслівалася, што незадаволенасць ва ўсіх колах грамадства адзначаюць нават партыйныя і савецкія крыніцы. У прыватнасці, у палітычнай справаздачы ЦК КПБ у студзені 1927 г. на Х з'ездзе КП(б)Б Крыніцкі адзначаў, што ў грамадстве прысутнічаюць непажаданыя для партыі настроі. Незадаволенасць у розных слаях грамадства была выклікана рознымі прычынамі. Сярод пралетарыяту і сялянства дамінавалі эканамічныя аспекты, а сярод інтэлігенцыі – палітычныя прычыны.

Найбольшай папулярнасцю савецкая ўлада карысталася ў гарадскога пралетарыяту, але яго колькасць не адыгрывала істотнай ролі. На 1925/26 г. у цэнзавай прамысловасці працавала 30213 чалавек, што складала 0,9 % ад колькасці насельніцтва. Да таго ж рабочыя характарызаваліся нізкім узроўнем класавай свядомасці, а пытанне аплаты працы адыгрывала галоўную ролю ў іх настроях. Адбываўся рост элементаў дэкласіраванага пралетарыяту і пашырэнне супраціву партыі ўзмацнялі беспрацоўныя, якіх на лістапад 1926 г. налічвалася 21446 чалавек. У асноўным гэта былі выхадцы з вёскі, якія шукалі працы ў горадзе па прычыне аграрнай перанаселенасці.

Асобную катэгорыю складалі жыхары мястэчак, якіх налічвалася 208846 чалавек (1923 г.) (населеныя пункты з больш 500 чалавек), у асоўным яўрэйскага паходжання. Пасля рэвалюцыі іх умовы жыцця таксама пагоршыліся: упадак гандлю, праслед ліхвярства і пасрэдніцтва, забарона выкарыстання наёмнай працы гэта фактары, якія моцна ўдарылі па эканоміцы мястэчак. Гэта выклікала незадаволенасць насельніцтва і стварала добры грунт для дзейнасці Бунда, сіяністаў і артадоксаў. У прыватнасці, на шкодніцкую дзейнасць сіяністаў спецыяльна звяртаў увагу сакратар ЦК Галадзед [2, арк. 6].

Найбольшыя праблемы стварала сітуацыя ў вёсцы, якая пакутавала ад перанаселенасці. 85,2% жыхароў БССР пражывала ў вёсцы. Адзначалася, што на 100 дзесяцін ворнай зямлі прыпадала 63,6 чалавека. Акрамя таго вельмі вялікім з'яўляўся прырост насельніцтва. З кожным годам насельніцтва вырастала на 97-100 тысяч чалавек. Адзначалася, што сяляне не разумелі, чаму пасля выгнання "паноў" не могуць атрымаць зямлі, скардзіліся на высокія кошты прамысловай прадукцыі, падаткі, свавольства лакальных улад, кляўзніцтва і г.д. Як лічылі супрацоўнікі Консульства, акрамя эканамічных повадаў, незадаволенасць сялянства ўзмацнялі грамадскія і нацыянальныя супярэчнасці паміж беларускім сялянскім насельніцтвам і яўрэйска-гарадскімі камуністычнымі элементамі. Супраціўленне праяўлялася ў выглядзе спроб стварыць своеасаблівую вясковую аўтаномію ці імкненнем выйсці з-пад нагляду партыйных улад. Часам даходзіла і да актыўных выступленняў [2, арк. 6–10].



Репозиторий ВГУ

На пазіцыю інтэлігенцыі ў значнай ступені ўплывалі палітычныя прычыны. З пункту гледжання адносін да ўлад інтэлігенцыю ўмоўна падзялялі на катэгорыі: 1) варожа настроеныя адносна камунізму (расійскія манархісты, мяшчане, беларускія нацыяналісты, якія рэкрутаваліся пераважна за кошт студэнтаў, моладзі і народных настаўнікаў); 2) нейтральныя (большасць чыноўнікаў); 3) лаяльныя (людзі на добрых пасадах, высокакваліфікаваныя і добрааплачваемыя спецы, спекулянты); 4) сімпатызуючыя камунізму.

Датычылася гэта і беспартыйнай беларускай інтэлігенцыі. Хто атрымаў добрыя пасады на кіруючых пазіцыях у Інбелкульце ці вышэйшай школе пагадзіліся з роллю інструмента ў руках партыі і выконвалі яе дырэктывы (тыповымі прадстаўнікамі называліся члены праўлення Інбелкульту Цвікевіч, Некрашэвіч, Смоліч і інш.), другая група заняла пасіўную пазіцыю, хоць і захоўвалі непрыязнь да савецкай улады. Трэцяя група ў асноўным моладзь, студэнты і настаўнікі – настроены апазіцыйна. Польскія дыпламаты адзначалі, што супраціўленне Савецкай уладзе паўставала на падставе нацыяналітычных тэндэнцый, якія Савецкая ўлада не была ў стане задаволіць нацыянальнай палітыкай.

Адзначалася, што нацыянальная палітыка партыі адыграла істотную ролю ў развіцці нацыянальнай беларускай свядомасці. За 1925–1926 гг. гэта свядомасць атрымала значнае пашырэнне ў беларускім грамадстве і ахапіла не толькі маладую інтэлігенцыю, але і пачала пранікаць у сялянства. Узмацняўся сялянскі нацыянальны сепаратызм, які апабіраўся на пачуцці агульнасці нацыянальных, грамадскіх і культурных інтарэсаў, якія ўсё больш супрацьпастаўляліся поглядам камуністычнай партыі на нацыю, грамадства і народ.

Спасылаючыся на невядомую адозву, супрацоўнікі консульства сцвярджалі, што незадаволенасць палітыкай беларусізацыі заключалася ў тым, што «адказныя пасады займалі “прызначэнцы”, а штучнасць беларусізацыі праяўлялася ў тым, што гэтых маскоўскіх прызначэнцаў прымушалі вучыць беларускую мову. Гэтыя “беларусы” павінны былі ствараць ілюзію, што, нібыта, воля беларускага народу ў справе нацыянальнага адраджэння выконваецца. Але паскарэнне тэмпаў беларусізацыі ў апошнія часы з выкарыстаннем маскоўскіх метадаў прымусу сведчыла, што нацыянальная свядомасць беларускага народу перарасла манёўры Масквы, што моцна непакоіла крэмлеўскіх фараонаў» [2, арк. 15–16]. Характэрна, што незадаволенасць нацыянальнай палітыкай стала пранікаць у саму партыю. У дыскусіі па дакладу Крыніцкага делегат ад Аршанскага павету Саўліч, выказваўся, што «калі Крыніцкі ў Маскве і там у палітбюро яго падцягнуць, то ён выказваецца за беларусізацыю, а як аддаляць, тады аддаляецца і беларусізацыя”. А у газеце “Звязда” напісана, што сялянства зараз ўжо ведае што значыць “дыктатура пралетарыяту” і разумее эканамічныя наступствы гэтага “панавання” рабочага класу. На “панаванні” Беларусі не пабудуеш. Выходзіць глупства, а не беларусізацыя» [2, арк. 16].

Абвешчаная партыяй неабходнасць барацьбы з беларускім нацыяналізмам, паводле сведчанняў дыпламатаў, зрабіла на беларускае грамадства вялікае ўражанне. Адбыўся пэўны перапалом і поглядах і псіхіцы ў большасці грамадства, асабліва моладзі. Пачалі задумывацца нават тыя, хто быў пасіўным і лаяльным да улады.

У якасці высновы сцвярджалася, што незадаволенасць нацыянальнай палітыкай адназначна не прыводзіць да высновы непазбежнага актыўнага выступлення. На стражы парадку стаяла ГПУ.

У наступных паведамленнях ад 21 і 23 чэрвеня 1927 г. прыводзілася інфармацыя аб арышце былых афіфэраў царскай арміі і 150 эсэраў, якія рыхтавалі акцыю супраць улад. Паводле інфармацыі консульства, у эсэраў былі знойдзены спісы фабрык, якія павінны былі быць спалены, банкаў, якія планавалася абрабаваць, а таксама і спіс камуністаў якіх планавалі забіць. У спісе пазначаны ўсе члены ўраду акрамя Галадзеду [2]. У паведамленнях адзначалася, што выступленні супраць улады прымаюць усё больш вострыя формы, асабліва сярод сялян, у якіх улады адбіраюсь хатнюю скаціну за неаплочаныя падаткі [2].

Цікавым з’яўляецца пытанне аб крыніцах інфармацыі, якую атрымлівалі супрацоўнікі Консульства. Неназваная асоба, на якую спасылаўся выконваючы абавязкі Консула Тадэуш Пяркоўскі, давала вельмі неадназначную характарыстыку шэрагу беларускіх дзеячаў. Паводле яе, былыя кіраўнікі БНР, якія вярнуліся з эміграцыі і выслужваліся перад Саветамі займалі кіруючыя пасады ў Інбелкульце, як напраклад былыя члены ўраду БНР Цвікевіч (вучоны сакратар) і Ластоўскі, а таксама Смоліч (намеснік старшыні Інстытуту), Некрашэвіч (старшыня лінгвістычнай камісіі) і большасць з іх з’ўляліся сляпым і бязвольным інструментам у руках Саветаў. Не мелі яны ніякага маральнага даверу і паўсюдна лічыліся за прадажных кар’ерыстаў

Рэпазіторый ВДУ

і палітычных шарлатанаў. Камуністы да іх ставіліся з пагардай, хаця прызнаваліся, што іх супрацоўніцтва з'яўляецца ім патрэбным з палітычных мэт і таму іх трымаюць і аплочваюць. Яны ў сваю чаргу імкнуцца зарабіць ласку ўлад сваім выслужваннем і з матэрыяльнага пункту гледжання жывуць добра. Інфарматар Консульства сцвярджаў, што падчас перамоў з Саветамі, якія папярэднічалі роспуску ўраду БНР у 1925 г. старшыня Рады БНР Цвікевіч спрабаваў спачатку вылучаць бальшавікам пэўныя палітычныя ўмовы, але яго асадзіў адзін з бальшавікоў, які заявіў, што савецкія дэлегаты не маюць часу на размовы і глупствы і пагаджацца толькі абмеркаваць умовы трансакцыі выражанай ў банкнотах.

Увогуле адзначалася, што палітычная атмасфера ў Беларусі была больш цяжкая, чым у іншых рэспубліках СССР, па прычыне павышанай пільнасці і падазрэнняў ГПУ.

У якасці характарыстыкі сваёй крыніцы кіраўнік консульства Тадэуш Пяркоўскі адзначаў, што гэта беларус, які працуе навукова і сам прызнаецца, што падчас кастрычніцкіх падзей сімпатызаваў савецкай уладзе [2].

Аналізуючы звальненні вядомых беларускіх дзеячаў (Жылуновіч, Ластоўскі і інш.) польскія дыпламаты ўжо тады заўважылі пэўную сістэму і невыпадковасць звальненняў у выглядзе спланаванай акцыі партыйных улад [3]. Шукаючы прычыны для гэтай акцыі, у якасці галоўнай называлі так званае "заходніцтва" як пэўны накірунак сярод дзеячаў БССР, якія лічылі, што развіццё мовы і культуры Беларусі неабходна базіраваць на заходняй культуры. Выразнікамі гэтых поглядаў, па інфармацыі консульства, былі пераважна прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Заходніцтва не з'яўлялася скаардынаваным палітычным рухам ці накірункам, хутчэй мела рысы вызначанай ідэі для адукаваных асоб. Сам тэрмін ужываўся хутчэй у простых размовах, чым афіцыйная назва палітычнай групоўкі. Але, як падкрэсліваў кіраўнік Генеральнага консульства Х. Янкоўскі, у размовах з прадстаўнікамі афіцыйных сфер Беларусі, ён адчуў, што найменш прыхільна да цэнтральных улад настаўлены тыя з гэтых прадстаўнікоў, каго залічвалі да прыхільнікаў "заходніцтва". Ён дапускаў такама, што непрыхільнасць належыла тлумачыць расчараваннем найбольш шчырых і нацыянальна настроеных беларускіх дзеячаў у палітыцы цэнтральных улад, якая не апраўдала ўскладзеных надзей. Відавочна цэнтральныя ўлады ўбачылі ў падобных поглядах зараджэнне магчымых сепаратысцкіх ідэй і таму выкарыстоўваючы розныя повады пазбавілі гэтых асоб пасад [3].

Справаздачы Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску ўяўляюць сабой выключна цікавую і недаследаваную крыніцу, інфармацыя якой патрабуе навуковай верыфікацыі і ўдакладнення на падставе кампаратыўнага даследавання польскіх і савецкіх архіўных матэрыялаў і гістарыяграфіі.


1. Ambasada RP w Moskwie. – Syg. 187.
2. Ambasada RP w Moskwie. – Syg. 150.
3. Ambasada RP w Moskwie. – Syg. 146.


**Зубко О.Е.**

## «СЛАВЯНСКИЙ МИР» ДМИТРИЯ ДОРОШЕНКО В УЧЕБНЫХ ПЛАНАХ УКРАИНСКОГО ВЫСШЕГО ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ИНСТИТУТА имени М. ДРАГОМАНОВА В ПРАГЕ (1923–1933 гг.)

Украинский высший педагогический институт имени М. Драгоманова в Праге (1923–1933) был одним из тех украинских эмиграционных вузов, в котором высшее образование смогли получить многие белорусы, оказавшиеся за пределами своего Отечества после 1917–1923 годов. (Среди наиболее известных фамилий: Л. Красковская, П. Бодунова, Т. Грыб и Н. Сазанович [4]). Многих из них можно было встретить в аудиториях естественно-математического, музыкально-педагогического факультетов. Но все же, подавляющее большинство обнаруживалось в рядах историко-филологического, кафедры которого были «укомплектованы» в то время сильнейшим профессорско-преподавательским составом. В частности, кафедру истории Украины УВПИ с 1 марта 1924 года по 1 января 1927 года возглавлял известный украинский историк, дипломат, публицист и общественно-политический деятель Дмитрий Иванович Дорошенко (1882–1951). Белорусам имя Дорошенко говорило о многом. Кроме того, что он был известным славяноведом в целом, он был первым, кто еще в свои студенческие годы научно обосновал не только национальное возрождение

Репозиторий ВГУ